**В. В. Яноўская, Р. У. Зянюк**

# ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ КАЎНАСКАГА АКРУГОВАГА АРХІВА: АНАЛІЗ СКРОЗЬ ПРЫЗМУ ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫХ ПРАБЛЕМ*

Скрозь прызму гістарыяграфічных праблем гісторыі Беларусі XIX—XX стст. паказаны інфармацыйны патэнцыял Каўнаскага акруговага архіва (Літва), масіў гістарычных дакументаў якога пачаў фарміравацца з 1843 г., калі сталі функцыянаваць розныя ўстановы новаўтворанай Ковенскай губерні. Частка дакументаў мае непасрэднае дачыненне да тэрыторыі Беларусі: той, што ў складзе Новааляксандраўскага (да 1836 г. — Браслаўскага) павета была перададзена з Віленскай губерні. Асноўная дакументацыя, звязаная з рознымі аспектамі жыццядзейнасці гэтай тэрыторыі, акрамя пашырэння геаграфічнай прасторы аб'екта даследавання дае магчымасць паглыбіць асобныя даследчыя праблемы.

In the light of historiographic problems of the Belarusian history of XIX—XX centuries we show the information potential of Kaunas region archive (Lithuania), where the array of historical documents started to be formed in 1843 with the start of work of the institutions of the new formed Kaunas province. Part of the documents is closely connected with the Belarusian territories of Novaaliaksandrauski (Braslauski before 1836) region annexed to it being before a part of Vilnius province. The main part of these documents dedicated to various aspects of life on these territories gives a possibility to deepen into some research problems along with the extension of geographic area of the object.

*Ключавыя словы*: архіўныя фонды; інфармацыйны патэнцыял; Каўнаскі акруговы архіў; Новааляксандраўскі павет.

*Keywords*: archive funds; information potential; Kaunas region archive; Novaaliaksandrauski region.

Прыступаючы да распрацоўкі новай праблемы, гісторыкі імкнуцца знайсці такія гістарычныя факты, якія дазволілі б ім калі не зрабіць навуковае адкрыццё, то ва ўсялякім разе пашырыць або паглыбіць уласны кругагляд і веды чытача. Кожны даследчык жадае зрабіць свой унёсак у гістарыяграфію, папоўніць тую гістарыяграфічную скарбонку, што склалася да яго часу. Папаўненне ведаў па праблеме можа быць (больш за тое, павінна быць!) не толькі фактаграфічным. Абагульняючыя, глыбокія тэарэтычныя даследаванні, заснаваныя на выпрабаванні розных метадаў і метадалагічных падыходаў, што распрацаваны даследчыкамі гуманітарнага профілю, вельмі дарэчы на сучасным этапе навуковага развіцця. Ды і «архіўны зуд» не будзе лішнім у працы навукоўцаў. Менавіта ён і занёс нас у Каўнаскі акруговы (раней — павятовы) архіў у пошуках новых звестак з мінулага роднай Беларусі.

* Аўтары выказваюць падзяку дырэктару Інстытута гісторыі НАН Беларусі Даніловічу Вячаславу Віктаравічу за падтрымку і разуменне навуковай неабходнасці паездкі, а таксама супрацоўнікам Каўнаскага акруговага архіва, у прыватнасці галоўнаму спецыялісту Нійоле Амбрашкене і архівісту Рамутэ Загурскене, за дапамогу падчас працы ў архіве і напісанне гэтага артыкула.

**Яновская Валентина Васильевна** — заведующий отделом историографии и методов исторического исследования Института истории НАН Беларуси, кандидат исторических наук, доцент. E-mail: janval@mail.ru; **Зянюк Раиса Владимировна** — научный сотрудник отдела историографии и методов исторического исследования Института истории НАН Беларуси, кандидат исторических наук. E-mail: raja.op@gmail.com

Але перш чым адгартаць некаторыя старонкі з дакументаў архіва, трэба адзначыць наступнае. За 85 гадоў існавання акадэмічнага Інстытута гісторыі яго супрацоўнікі ўпершыню патрапілі ў гэта архівасховішча. Чаму? Думаецца, тут спрацаваў шэраг фактараў як суб'ектыўнага, так і аб'ектыўнага характару. Да іх мы адносім у першую чаргу недасканалую развітасць гістарычнай геаграфіі і стаўшую класічнай схему распрацоўкі даследчых праблем XIX ст. у межах 35 *беларускіх* паветаў [1]. Былі і іншыя перашкоды. У 1997 г. на IV Браслаўскай краязнаўчай канферэнцыі прадстаўнікі архіва Ёзас Рымкус і Віталія Гірчытэ[1] незапатрабаванасць матэрыялаў архіва з боку беларускіх даследчыкаў тлумачылі наступным чынам. У сувязі з тым, што матэрыялы, якія тычыліся перыяду існавання Ковенскай губерні ў складзе Расійскай імперыі, планавалася перадаць у Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы, што ў Вільнюсе, звесткі аб іх не былі ўключаны ні ў даведнік фондаў Каўнаскага архіва (выйшаў у 1986 г., калі матэрыялы фонда з літарай «І» — *гісторыя* ўжо не лічыліся прыналежнымі да гэтага архіва), ні ў даведнік ДГАЛ (1990 г.), куды яны так і не былі перададзены. Навукоўцы выказалі спадзяванне, што «документы, пока еще не использовавшиеся исследователями, заинтересуют историков и краеведов Браславщины» [2]. Браслаўскі краязнаўца навуковы супрацоўнік гісторыка-краязнаўчага музея Канстанцін Сяргеевіч Шыдлоўскі надрукаваў шэраг дакументаў з Каўнаскага акруговага архіва ў выданнях «Браслаўскія чытанні», «Браслаўскія сшыткі», якія прысвечаны розным аспектам сацыяльнага, эканамічнага і канфесійнага развіцця Браслаўшчыны XIX ст. А вось прац акадэмічных даследчыкаў прыйшлося чакаць яшчэ амаль дваццаць гадоў. Тут ужо спрацавалі эканамічныя фактары: з кожным годам беларускім гісторыкам становіцца цяжэй выбірацца ў замежныя архівы, а калі і з'яўляецца такая магчымасць, то трапляюць яны ў тыя архівасховішчы, што, як добра вядома, утрымліваюць вялізны масіў разнастайных матэрыялаў практычна па ўсёй нашай тэрыторыі.

Масіў дакументаў Каўнаскага архіва пачаў фарміравацца з 1843 г., калі сталі функцыянаваць установы новаўтворанай (паводле імяннога ўказа «О преобразовании Северо-Западных Губерний» ад 18.12.1842 і адпаведнага сенацкага ўказа ад 27.07.1843) Ковенскай губерні. Частка з іх мае дачыненне да нашай тэрыторыі — той, што ў складзе Новааляксандраўскага (да 1836 г. — Браслаўскага) павета была перададзена з Віленскай губерні. Асноўная колькасць дакументацыі, звязанай з рознымі аспектамі жыццядзейнасці гэтай тэрыторыі, утрымліваецца ў фондах: а) губернскага ўзроўню: І-49 (Ковенскае губернскае праўленне), І-50 (Канцылярыя Ковенскага грамадзянскага губернатара), І-51 (Ковенскае губернскае «присутствие» па сялянскіх справах), І-53 (Ковенскі губернскі камітэт па справах аб таварыствах), І-54 (Ковенскае губернскае «присутствие» па справах аб вайсковай павіннасці), І-62 (Упраўленне дзяржаўных маёмасцей Ковенскай губерні), І-65 (Ковенскі губернскі царкоўна-будаўнічы камітэт), І-66 (Ковенская губернская чарцёжная), І-68 (Ковенскі губернскі статыстычны камітэт), І-77 (Ковенская палата грамадзянскага суда), І-293 (Ковенская дырэкцыя народных вучылішч), І-338 (Міравыя суддзі Ковенскай губерні); б) павятовага ўзроўню: І-2 (Новааляксандраўскае павятовае паліцэйскае ўпраўленне), І-7 (Новааляксандраўскі паліцэйскі наглядчык Ковенскай губерні), І-208 (Відзская мяшчанская ўправа Новааляксандраўскага павета), І-250 (Браслаўскае валасное праўленне), І-337 (Пажайскі Успенскі манастыр Ковенскай губерні), І-359 (Новааляксандраўскі павятовы распарадчы камітэт),

[1] Віталія Гірчытэ — гісторык-архівіст (скончыла гістарычны факультэт Вільнюскага дзяржаўнага ўніверсітэта), загадчык аддзела выкарыстання дакументаў. У 1997 г. была старшым навуковым супрацоўнікам Каўнаскага акруговага архіва. Ёзас Рымкус — гісторык-архівіст (скончыў бібліятэчны факультэт Вільнюскага дзяржаўнага ўніверсітэта). У 1993—2001 гг. з'яўляўся дырэктарам Каўнаскага акруговага архіва. У 2001 г. на «Браслаўскіх чытаннях» даследчыкі выступілі з сумесным дакладам «Материалы Каунасского окружного архива о еврейских обществах Браславского края середины XIX — начала XX века», у якім зноў адзначылі незапатрабаванасць дакументаў архіва з боку даследчыкаў.



Удзельнікі паўстання 1863–1864 гг., якія былі аб’яўлены ў вышук.
Красавік — жнівень 1864 г. (КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 587)

І-413 (Падатковы інспектар Новааляксандраўскага павета), І-1602 (Новааляксандраўскі павятовы суд).

Дакументы архіва перш за ўсё даюць магчымасць пашырыць геаграфічныя межы пры даследаванні розных праблем гісторыі Беларусі для выяўлення поўнай карціны па ўсёй тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь. Гэта асабліва важна пры разглядзе такіх праблем, як: а) змяненні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, мясцовае кіраванне і самакіраванне, зямельныя і іншыя маёмасныя адносіны; б) ваенна-палітычныя падзеі і ўдзел у іх розных груп насельніцтва. У першым выпадку цікавасць уяўляюць тыя справы, што паказваюць дакладныя статыстычныя даныя па павеце ў цэлым, а таксама па асобных валасцях і установах [3—8]. Фонд І-66 утрымлівае геадэзічнае апісанне зямель (воп. 3), межавыя кнігі розных маёнткаў (воп. 4), зямельныя планы (воп. 6). Гэтыя матэрыялы практычна не ўведзены ў навуковы зварот і чакаюць сваіх даследчыкаў.

Інфармацыйны патэнцыял дакументаў архіва для адлюстравання ваенна-палітычных падзей і ўдзелу ў іх розных груп даволі значны. Перш за ўсё, матэрыялы архіва даюць магчымасць: а) пашырыць спіс удзельнікаў паўстанняў 1830—1831 і 1863—1864 гг.; б) больш дакладна ўстанавіць сацыяльную і канфесійную структуру ўдзельнікаў; в) рэканструяваць атмасферу ўсеагульнай падазронасці, што пранікала ва ўсе слаі насельніцтва. У велізарным томе, што ўтрымлівае звесткі пра ўдзельнікаў паўстання 1830—1831 гг. (працяг гэтага тома, які таксама нейкім чынам апынуўся ў Коўне, быў знойдзены выпадкова літаральна некалькі гадоў таму ў Ваенным гістарычным музеі імя Вітаўтаса Вялікага), нямала імёнаў з тэрыторыі Беларусі. Перш за ўсё гэта жыхары паветаў тагачасных Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў (Ашмянскі, Браслаўскі, Ваўкавыскі, Лідскі, Навагрудскі і інш.) і выхаванцы Віленскага ўніверсітэта. Радзей сустракаюцца прозвішчы ўраджэнцаў Віцебскай губерні [9]. Другая справа, якая ўтрымлівае спіс удзельнікаў паўстання 1863—1864 гг., таксама сведчыць аб іх разнастайнай саслоўнай, этнічнай і канфесійнай прыналежнасці [10].

Матэрыялы Каўнаскага акруговага архіва дазваляюць пераканацца ў правільнасці (а камусьці, мабыць, і ў памылковасці) тых ацэнак, якія ўжо замацаваліся ў беларускай гістарыяграфіі ў адносінах да розных канфесійных груп падчас паўстанняў 1830—1831 і 1863—1864 гг. Напрыклад, у сучаснай беларускай гістарыяграфіі пазіцыя старавераў беларуска-літоўскіх зямель падчас паўстання 1863—1864 гг. нярэдка характарызуецца як пазіцыя прыхільнікаў урада, што, між іншым, цалкам адносіцца і да папярэдняга паўстання, якое адбылося ў 1830—1831 гг. Праўда, звестак, на падставе якіх грунтуюцца гэтыя высновы, у архівасховішчах Беларусі засталося не так і шмат, таму яны могуць выклікаць сумненні ў рэпрэзентатыўнасці. Пераканацца ў правільнасці ацэнкі пазіцыі старавераў як памагатых урада падчас паўстання 1830—1831 гг. можна, прааналізаваўшы вышэйзгаданы спіс. Сярод соцень тых, хто быў уключаны ў спісы паўстанцаў, судовыя справы якіх адбываліся на тэрыторыі Віленскай губерні, можна сустрэць людзей усіх веравызнанняў, акрамя старавераў [9]. І гэта нягледзячы на тое, што на тэрыторыі Ковенскай губерні пражывала даволі вялікая колькасць людзей, прыналежных да гэтай канфесійнай групы. Так, па звестках «Памятных книжек Ковенской губернии» за канец 1860-х гг., у маштабе ўсёй губерні старaверы складалі прыкладна 1,7 % агульнай колькасці жыхароў, прычым у Новааляксандраўскім павеце — больш за 6 %, а ў заштатным г. Відзы — больш за 18 %. Перапіс 1897 г. зафіксаваў наступныя лічбы: у губерні — 2,1 %, Новааляксандраўскім павеце — 10,7 %, заштатным г. Відзы — 10,7 %, чым пацвердзіў, што губерня (павет) захавала статус тэрыторыі з вялікай удзельнай колькасцю старавераў.

На карысць гэтай версіі, але ўжо ў дачыненні да 1863—1864 гг., можна прывесці і другую справу з фонду І-50 «О награждении старообрядцев Акинфова и Смирнова, пострадавших от восстания 1863 года» (раней было «мятежников», але закрэслена. — *В. Я.*, *Р. З.*) [11]. Тое, што ў аднаго з іх «разграбили имущество», а другога «разыскивали для того, чтобы повесить», выклікала разгляд справы на ўзроўні ваенны начальнік Вілкамірскага павета — начальнік Ковенскай губерні — віленскі, ковенскі, гродзенскі і мінскі генерал-губернатар.

Праўрадавая пазіцыя старавераў падчас паўстання 1863—1864 гг. не сустракала станоўчага водгуку землеўласнікаў Ковенскай губерні. Свой пратэст яны выказвалі разрывам зямельных адносін са старaверамі і іх высяленнем з арэндаваных зямель. Такія падзеі былі зафіксаваны і ў Новааляксандраўскім павеце, дзе памешчык Канстанцін Чарноцкі, западозраны ў сувязі з паўстанцамі, яшчэ ў лютым 1863 г. быў падвергнуты «формальному следствию», але быў апраўданы. Праз два гады следства было адноўлена. Прычынай стала высяленне Чарноцкім старавераў з арэндных зямель і іх жаданне адпомсціць памешчыку. Вырашыўшы выкарыстаць палітычны матыў, старaверы данеслі, што Чарноцкі вербаваў у «шайки польских мятежников людей, в том числе и из старообрядцев» [12, арк. 93]. І толькі ў маі 1867 г. Чарноцкі быў вызвалены ад следства.

Да сёняя пытанне ўдзелу яўрэяў беларуска-літоўскіх губерняў у паўстанні 1863—1864 гг. лічыцца «белай плямай» у гістарыяграфіі [13, с. 170], што цалкам адносіцца і да паўстання 1830—1831 гг. Матэрыялы Каўнаскага архіва дазваляюць уключыцца ў спрэчкі па пытанні матывацыі і форм удзелу яўрэяў у дадзеных падзеях. На шматлікіх старонках вялізнай справы аб удзельніках паўстання 1830—1831 гг. у асобныя групы вылучаны «*евреи*», на некаторых з іх ідзе пералік прозвішчаў цэлымі сем'ямі. Найбольш тыповы запіс іх «злачынстваў» гучыць прыкладна так: «Ерухим Мордухович Глозер, еврей Ошмянского уезда. Подписал присяжный лист на верность Ошмянским мятежникам» [9, арк. 162—163 адв.]. Сустракаюцца звесткі і пра больш важкі ўдзел прадстаўнікоў яўрэйскага насельніцтва. Маюцца дакументы і аб удзеле яўрэяў у паўстанні 1863—1864 гг. [14].

Больш узгодненымі з'яўляюцца гістарыяграфічныя ацэнкі пазіцыі духавенства і вернікаў рымска-каталіцкай царквы ў палітычных супрацьстаяннях — у большасці як прыхільнікаў паўстанняў. Дакументы Каўнаскага архіва пацвярджаюць гэту версію звесткамі аб грамадска-палітычнай дзейнасці як каталіцкага духавенства, так і каталіцкіх інстытутаў (манасты-




Вокладка справы «О награждении старообрядцев
Акинфова и Смирнова, пострадавших от восстания 1863 г.»
(КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 539)

роў). Напрыклад, у асобнай справе прадстаўлена фіксацыя падзей паўстання 1863—1864 гг. і ўдзел у іх каталіцкіх манастыроў, а таксама мерапрыемстваў урада па кантролі за іх дзейнасцю [15]. Больш шматлікімі з'яўляюцца звесткі аб палітычнай недабрадзейнасці каталіцкіх ксяндзоў [16—20].

Праблема пазіцыі/удзелу вышэйшага каталіцкага духавенства ў паўстаннях XIX ст. да гэтага часу выклікае розныя гістарыяграфічныя ацэнкі. Думаецца, інакш і быць не магло. Пры ацэнцы любой палітычнай акцыі на першы план выходзіць не столькі імкненне аўтара наблізіцца да навуковай аб'ектыўнасці, колькі а) пануючая/адзіная канцэптуальная схема падачы дадзеных праблем (савецкі і дасавецкі час) і б) уласнае бачанне і пазіцыя канкрэтнага аўтара (сучасная гістарыяграфія). Як вынік — пры адным і тым жа «наборы» фактаў розныя аўтары не могуць знайсці ўзаемапаразуменне і выпрацаваць адзіныя падыходы. Ды і з якіх пазіцый ацэньваць, напрыклад, заклікі вышэйшага каталіцкага кліра да ўзброенага выступлення супраць тых, каму яшчэ нядаўна самі прысягалі на вернасць? Тым больш, што

выступленне супраць дзяржаўнай улады заўсёды разглядалася як несумяшчальнае з канонамі каталіцкай царквы, што і было адзначана ў энцыкліцы Пія IX Urbi Urbaniano ад 30 ліпеня 1864 г. Праўда, і пазіцыя Ватыкана, нягледзячы на кананічныя перасцярогі, мянялася ў сітуацыі, калі ўключаліся палітычныя матывы або адбываліся адкрытыя наступы расійскіх улад на рымска-каталіцкую царкву ў імперыі.

У якасці прыкладу следавання пануючай канцэпцыі ў дачыненні да пазіцыі ў паўстанні вышэйшага каталіцкага кліра прывядзём прэзентацыю адозвы цяльшэўскага епіскапа Мацея Казіміра Валанчэўскага ў зборніку дакументаў, што быў выдадзены ў 1940 г. Кожны дакумент зборніка папярэджвала канцэптуальная «застаўка», якая не пакідала ніякіх сумненняў у тым, з якой мэтай той ці іншы дакумент тут быў змешчаны. Што датычыцца дадзенага дакумента, то ён быў змешчаны ў рубрыцы «Здрадніцкая роля вышэйшага каталіцкага духавенства і яго паслугі цару» [21, с. 539]. Адозва датавалася 6 верасня 1863 г., і гэта павінна было азначаць, што, як толькі паўстанцкі рух пайшоў на спад і стала відавочнай яго параза, вышэйшае духавенства рэзка змяніла сваё стаўленне да падзей. Але ў дадзеным выпадку ўсё не так проста. Епіскап Валанчэўскі ад самага пачатку прытрымліваўся пазіцыі адмоўнага стаўлення да ўзброенага паўстання і заклікаў падпарадкаванае яму духавенства і прыхажан маліць Госпада, «дабы водворил между нами мир, спокойствие и взаимную милость». Прыведзеная ў зборніку дакументаў адозва была ўжо не першай спробай цяльшэўскага епіскапа ўсталяваць мір у краі, на што ўказваюць і яго словы з дадзенай адозвы: «В начале смятения в нашем крае, посылая к вам послание, приглашал я вас к раскаянию...». Можна было б і не звярнуць увагі на гэтыя словы, але ў Каўнаскім архіве захоўваецца копія той, ранейшай, адозвы (ад 29 сакавіка 1863 г.), з якой епіскап звяртаўся да сваёй паствы: «...дабы все до одного обливались слезами раскаяния... чтобы вы все от настоящего числа ксендзы или паны, богатые или бедные, взрослые или малые... произносили молитву Господню в честь пресвятые Богородицы нашей... доколе не устанут в нашем краю беспорядки» [22, арк. 2 адв. — 3 адв.]. Вось і ўзнікае пытанне: як з пункту гледжання сучаснасці нам, гісторыкам, ацэньваць паслядоўную пазіцыю епіскапа, заснаваную на падпарадкаванні канонам царквы, якую ён прадстаўляў, і на жаданні міру і спакою для сваёй паствы?

Прыкладам падазроных адносін і недаверу з боку прадстаўнікоў уладных структур да рымска-каталіцкага духавенства ўсіх рангаў (нават пры ўмове лаяльнасці той ці іншай асобы) служыць запіс у справе «Списки участников восстаний. 1831—1836 гг. (А—К)». Тут у спіс пад № 183 трапіў прадстаўнік вышэйшага рымска-каталіцкага духавенства — кіраўнік Віленскай епархіі, брэсцкі епіскап-суфраган Анджэй Бенедыкт Клангевіч. Падставай для разгляду справы ў судовых органах паслужыла западозранасць у схаваным матыве прадпісання епіскапа аб працягу тэрміну велікоднай споведзі. На падставе ўказа ад 4 кастрычніка 1832 г. епіскап быў вызвалены «от следствия и суда» [11, арк. 416 адв. — 417].

Вельмі рэдкімі з’яўляюцца архіўныя звесткі аб удзеле ў паўстанні 1863—1864 гг. мусульманскага насельніцтва (незалежна ад таго, з якога боку быў зафіксаваны гэты ўдзел). У апублікаваных нешматлікіх работах прадстаўлены розныя пункты погляду на гэтае пытанне. Адны аўтары сцвярджаюць, што мусульманскае насельніцтва і яго духоўныя настаўнікі захоўвалі сяброўскі нейтралітэт, пазбягаючы актыўных дзеянняў. Іншыя прыводзяць даныя аб высылцы ў Сібір на катаржныя работы тых, хто браў удзел у паўстанні, прыняцці рэпрэсіўных мер супраць іх (налажэнні кантрыбуцыі, канфіскацыі маёнткаў, спаганянні падаткаў на будаўніцтва праваслаўных цэркваў, забароне выкарыстоўваць польскамоўныя надпісы на могілках і інш.). У работах апошніх гадоў утрымліваюцца нешматлікія звесткі аб удзеле ваенных (з літоўскіх татар) як у шэрагах паўстанцаў, так і ў расійскім войску.

А вось аб пазіцыі той ці іншай духоўнай асобы зусім няма згадак. Па даных «Памятной книжки Ковенской губернии на 1872 год», у 1869 г. у Відзах пражывалі 283 мусульманіны (што складала 14,6 % ад усяго насельніцтва горада), у той час як ва ўсёй Ковенскай губерні —

422 (0,04 % ад агульнай колькасці). Таму вельмі ўзрадавала нас знойдзеная ў Каўнаскім архіве справа пад назвай «О награждении муллы Якова Якубовского». Тое, што гэта маленькая справа адносілася да нашай тэрыторыі, а канкрэтна — заштатнага г. Відзы, зусім не падаецца выпадковым, бо менавіта ў гэтым гарадку і пражывала большасць мусульманскага насельніцтва як Новааляксандраўскага павета, так і Ковенскай губерні ўвогуле. Дакумент датуецца 19 лістапада 1866 г. і быў адпраўлены з Асобай канцылярыі па палітычных справах у адрас Новааляксандраўскага ваеннага начальніка. У ім гаворыцца: «В дополнение к рапорту от 30 сентября сего года за № 3466 прошу Ваше Высокоблагородие донести мне, какие именно оказал услуги Правительству мулла Видзской соборной мечети Яков Якубовский, и при том присовокупить свое заключение как о степени его благонадежности, так и о том, в какой степени заслуживает уважения ходатайство просителя» [23, арк. 1]. Прасачыць далейшы ход перапіскі не ўдалося, але відавочна, што мула Відзскай мячэці не мог быць на баку паўстанцаў, бо тых ссылалі ў Сібір, а не падавалі на ўзнагароду.

Важнай даследчыцкай праблемай, што можа быць паглыблена і ўдакладнена з дапамогай дакументаў Каўнаскага акруговага архіва, з’яўляецца канфесійная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі ў XIX — пачатку XX ст. І не толькі за кошт пашырэння геаграфічных меж і ўключэння ў даследчы спектр паўночна-заходняй часткі Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні. З аднаго боку, канфесійная палітра павета адлюстроўвала практычна ўвесь спектр веравызнанняў, характэрных для беларуска-літоўскіх зямель, якія ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі, што дае магчымасць пацвердзіць тыповасць або выявіць адметнасць той ці іншай з’явы. З другога — гэта не вельмі значная (у колькасным вымярэнні тэрыторыі і насельніцтва) частка мела даволі характэрныя асаблівасці ў размеркаванні насельніцтва па канфесіях, а таксама іншае ў параўнанні з астатнімі губернямі этнаканфесійнае асяроддзе. Таму многія працэсы праходзілі тут больш яскрава і паказальна.

Пашырэнне геаграфічных меж пры аналізе канфесійнай сітуацыі на тэрыторыі Беларусі дазваляе ўдакладніць адміністрацыйна-ўпраўленчую структуру розных канфесій і яе рэарганізацыю, канфесійны склад насельніцтва той беларускай часткі, што раней выпадала з поля зроку даследчыкаў. Напрыклад, пасля Полацкага сабору 1839 г. і далучэння ўніяцкай царквы да праваслаўнай была праведзена рэарганізацыя структур праваслаўнай царквы. Так, у 1843 г. была закрыта Беларуска-Літоўская калегія. Дакументы, якія адлюстроўваюць працэс закрыцця (пераважна ўрадавыя распараджэнні), выдзелены ў асобную справу [24]. Асобна адлюстраваны працэс пераходу ў падпарадкаванне Камісіі духоўных вучылішч і обер-пракурора Св. Сінода ўніяцкіх школ у 1836 г. [25].

Звесткі аб канфесійных установах асобных населеных пунктаў, што ўтрымліваюць статыстычныя апісанні гарадоў, валасцей і ўстаноў, могуць выкарыстоўвацца пры распрацоўцы гісторыі гарадоў/мястэчак і вёсак. Так, пры апісанні г. Браслава за 1885 г. адзначаецца наяўнасць у горадзе культавых будынкаў усіх канфесій [3, арк. 63 адв.]. А дакументы з фонду І-66 утрымліваюць планы ўгоддзяў, што належалі Браслаўскай праваслаўнай царкве [26—28]. Дзякуючы наяўнасці спраў, якія адлюстроўваюць колькасны паказчык сінагог, малітоўных школ па паветах Ковенскай губерні ў розныя перыяды, магчыма прасачыць дынаміку іх развіцця на Ковеншчыне ў XIX — пачатку XX ст.

У асобныя фонды выдзелены дакументы шэрагу цэркваў і манастыроў. Найбольш значным з іх з’яўляецца фонд Пажайскага Успенскага манастыра Ковенскага павета, у якім сабраны дакументы за 1797—1915 гг. (фонд І-337 (1468)). Дакументы фонду асвятляюць розныя аспекты жыццядзейнасці манастыра. Сярод іх знаходзяцца цікавыя адзінкі, што датычаць уніяцкіх манастыроў на беларускіх землях (напрыклад, Беразвецкага) [29].

Дакументы архіва дазваляюць удакладніць наступныя аспекты праблемы: а) царкоўна-будаўнічы; б) персанальны (лёсы духоўных асоб); в) пытанні міжканфесійных пераходаў;

г) адукацыйны; д) дзяржаўнага рэгулявання дзейнасці, зместу, форм дабрачыннасці; е) моўную палітыку ў дачыненні да каталіцкай і пратэстанцкай канфесій і інш.

Асобныя крыніцы дазваляюць рэканструяваць працэсы будаўніцтва цэркваў у Браславе і Анталептах, што дае магчымасць праз распараджэнні губернскіх улад прасачыць агульную працэдуру ажыццяўлення праваслаўнага храмабудаўніцтва і перабудовы/пераабсталявання былых уніяцкіх храмаў пад праваслаўныя на Ковеншчыне, каб параўнаць яе з іншымі рэгіёнамі Беларусі [30; 31].

«Персанальны аспект» прадстаўлены ў большасці звесткамі пра рымска-каталіцкае духавенства [32—36]. Яны адлюстроўваюць розныя кірункі дзейнасці святароў і дазваляюць скласці іх як асобныя, так і тыповыя партрэты, выявіць патрабаванні ўладаў да іх. У большасці выпадкаў гэта інфармацыя датычыць святароў, якія дзейнічалі не толькі на тэрыторыі Новааляксандраўскага павета. Выяўленыя аспекты могуць быць выкарыстаны як для адлюстравання агульнаімперскай канфесійнай сітуацыі, так і для апісання спецыфікі рэгіёна ў межах Расійскай імперыі. Так, у справе пад назвай «О вредной деятельности настоятеля Субочского костёла ксендза Франца Козловского» знаходзяцца матэрыялы, што дазваляюць адлюстраваць сітуацыю пасля прыняцця маніфеста 1905 г. У данясенні на імя начальніка Ковенскага жандармскага паліцэйскага ўпраўлення значылася: «Настоятель Субочского костёла ксендз Франц Францевич Козловский ярый литовец, фанатик и враждебно относится ко всему русскому» [37, арк. 1], у сувязі з чым абмяркоўвалася немагчымасць яго далейшага знаходжання на пасадзе.

Персанальныя звесткі пра ксяндзоў утрымліваюцца і ў дакументацыі Ковенскай дырэкцыі народных вучылішч. Яны адлюстроўваюць працэс ажыццяўлення кантролю над каталіцкімі святарамі і дзейнасцю тых з іх, што займалі пасады выкладчыкаў Закону Божага ў школах губерні. Па сведчаннях дакументаў, важнейшым крытэрыем прафпрыдатнасці святара на пасадзе законавучыцеля з'яўлялася яго прарасійская пазіцыя. Персанальная дакументацыя дазваляе даследаваць працэсы ратацыі каталіцкага духавенства па парафіях, а святароў-законавучыцеляў — па народных і прыходскіх вучылішчах Ковенскай губерні [38; 39].

Дакументы архіва адлюстроўваюць таксама стан матэрыяльнага забеспячэння пратэстанцкіх прапаведнікаў, што можа быць выкарыстана для кампаратыўнага аналізу пры даследаванні штодзённага жыцця пратэстанцкіх пастараў і прапаведнікаў. Па колькасці пратэстантаў Ковеншчына выдзялялася сярод іншых паўночна-заходніх губерняў імперыі. Менавіта таму паўставалі пытанні аб наданні дзяржаўнага забеспячэння большай, чым прадпісвалася, колькасці духавенства на гэтай тэрыторыі, а таксама пераразмеркаванні ўтрымання [40].

Пытанні міжканфесійных пераходаў, або пераразмеркавання насельніцтва паміж рознымі канфесіямі, заўсёды былі балючымі ў Расійскай імперыі па прычыне аховы дзяржаўнымі законамі інтарэсаў праваслаўя. Гэтыя тэндэнцыі асабліва яскрава праявіліся на Ковеншчыне, дзе праваслаўная царква займала вельмі нетрывалыя пазіцыі. Дакументы архіва адлюстроўваюць працэсы «знешняга папаўнення» колькасці праваслаўных вернікаў на Браслаўшчыне, што былі звязаны не толькі з ліквідацыяй уніяцкай царквы і ўключэннем яе вернікаў у шэрагі праваслаўных [41]. Такія працэсы тычыліся і тых, чые продкі (маці або бацька) «паходзілі з уніятаў», нават калі былі ахрышчаны ў рымска-каталіцкай царкве і пацвярджалі гэта дакументальна [42].

Моцныя пазіцыі старавераў у Новааляксандраўскім (Браслаўскім) павеце выклікалі спробы далучыцца да іх з боку праваслаўных вернікаў. Такая сітуацыя назіралася, напрыклад, у Відзах у 1822 г. У 1827 г. 49 праваслаўных вернікаў Друйскай Дабравешчанскай царквы далучыліся да старавераў [43, арк. 18, 19]. Працэс пашырэння раскольніцтва ў Браслаўскім павеце дэманструюць і спісы «совратившихся» (1829). Падобная з'ява, адрозная ад іншых мясцовасцей Беларусі, можа тлумачыцца ўплывам канфесійнага асяроддзя, якое характарызавалася значнай перавагай старавераў над праваслаўнымі вернікамі.

Адным з важных напрамкаў дзейнасці рэлігійных устаноў заўсёды з'яўлялася дабрачыннасць. Але, як было ўстаноўлена ў ходзе выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011—2015 гг. супрацоўнікамі аддзела гістарыяграфіі і метадаў гістарычнага даследавання Інстытута гісторыі НАН Беларусі, гэтае пытанне ставілася ў якасці самастойнай даследчай задачы толькі ў ракурсе асобных канфесій — праваслаўнай і іўдзейскай. І ніколі пры аналізе праблемы не прымяняўся кампаратыўны метад. Перш за ўсё гэта можна патлумачыць наяўнасцю/адсутнасцю дастатковай базы крыніц па іншых канфесіях, што ўтрымліваюць архівасховішчы Беларусі. У адносінах да каталіцкай царквы дадзеная акалічнасць тлумачыцца ўрадавай палітыкай. Калі на працягу ўсяго XIX ст. дабрачынныя акцыі праваслаўнай царквы мелі падтрымку з боку ўрада, то магчымасці каталіцкага касцёла з сярэдзіны XIX ст. былі значна зменшаны. І толькі паслабленне ўмоў дзейнасці рэлігійных устаноў розных веравызнанняў пасля прыняцця ўказа аб верацярпімасці (25 красавіка 1905 г.) спарадзіла ўзрост актыўнасці каталіцкага касцёла ў галіне дабрачыннасці, што даволі выразна адлюстроўваюць дакументы Каўнаскага архіва. Падобныя матэрыялы (а іх тут захавалася даволі шмат) дазваляюць рэканструяваць, як адбываўся/мог адбывацца падобны працэс і на іншых беларускіх землях.

Як вынікае з аналізу дакументальных матэрыялаў Каўнаскага архіва, дабрачынныя арганізацыі каталіцкага касцёла ствараліся: а) па прафесійным прынцыпе (рабочых, служанак і работніц, арганістаў і г. д.); б) па гендарнай прыкмеце (жаночыя і мужчынскія); в) па напрамках дзейнасці (таварыствы цвярозасці, таварыствы распаўсюджвання ведаў, апекі над дзецьмі і інш.). Вектар дзейнасці дабрачынных таварыстваў быў пераважна знешні: для каталіцкіх вернікаў (свецкіх) пры ўдзеле (дапамозе ў арганізацыі, кантролі над дзейнасцю) каталіцкага духавенства. Аднак не выключаўся і ўнутраны: дабрачыннае таварыства існавала ў Цяльшэўскай семінарыі для дапамогі маламаёмасным семінарыстам [44]. Аб ступені распаўсюджанасці каталіцкіх дабрачынных таварыстваў могуць служыць такія звесткі: на пачатку XX ст. толькі ў Коўне налічвалася 14 разнастайных каталіцкіх таварыстваў (сярод якіх «Шаўле» — таварыства распаўсюджвання ведаў сярод літоўцаў, жаночае таварыства св. Зіты, таварыства рабочых імя св. Юзафа, таварыства арганістаў імя папы св. Грыгорыя Вялікага, каталіцкае таварыства служанак і работніц пад назвай Пакрова Божай Маці і інш.) [45].

Прыемна ўразіла нас колькасць архіўных спраў, прысвечаных пратэстанцкай дабрачыннасці. Дакументы засведчылі, што пратэстанцкія дабрачынныя таварыствы былі монаканфесійнымі і ў сферу апекі траплялі выключна члены канкрэтнай абшчыны. У некаторых выпадках яны абмяжоўваліся і па нацыянальнай прыкмеце. Дзейнасць пратэстанцкіх дабрачынных таварыстваў на Ковеншчыне была скіравана перадусім на матэрыяльную падтрымку бедных сем'яў і асоб адпаведнага веравызнання, дапамогу ў аплаце навучання дзяцей у школах, утрыманне або падтрымку дзейнасці багадзельняў, выхаванне моладзі ў хрысціянскім духу [46, арк. 16]. Дакументы адлюстроўваюць як персанальны склад пратэстанцкіх (пераважна лютэранскіх) дабрачынных таварыстваў, так і асноўныя напрамкі іх дзейнасці. Аналіз дакументаў дазваляе сцвярджаць, што яны з'яўляліся ўсесаслоўнымі аб'яднаннямі. У склад таварыстваў уваходзілі сяляне, мяшчане, дваране евангеліцка-рэфармацкага і евангеліцка-лютэранскага веравызнання [46].

Такім чынам, матэрыялы Каўнаскага архіва пацвердзілі правільнасць высноў, што былі зроблены ў ходзе выканання вышэйпазначанай дзяржаўнай праграмы: а) аб унутрыканфесійным характары пратэстанцкай дабрачыннасці; б) аб сферах распаўсюджання дабрачыннай дзейнасці пратэстантаў (адукацыйная, медыцынская, сацыяльная); в) аб формах арганізацыі гэтай дзейнасці (стварэнне прыютаў, выхаванне дзяцей, арганізацыя адукацыйных цэнтраў, заснаванне спецыяльных фундушоў, падаянне). Разам з тым выяўлены матэрыял па пратэстанцкіх таварыствах можа быць выкарыстаны ў параўнаўчых мэтах: для ілюстрацыі большай актыўнасці пратэстанцкіх абшчын Ковенскай губерні ў сферы дабрачыннасці ў

параўнанні з тымі, што дзейнічалі на тэрыторыі Мінскай, Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў. Дакументы дазваляюць выдзеліць спецыфічныя напрамкі дабрачыннай дзейнасці пратэстанцкай царквы на Ковеншчыне (жаночая дабрачынная дзейнасць, гурткі па хрысціянскім выхаванні моладзі) і паставіць пытанне на перспектыву — наколькі гэтыя формы атрымалі распаўсюджанне і на іншых беларуска-літоўскіх землях?

Моўная палітыка і яе месца ў канфесійнай гісторыі Беларусі заўсёды выклікае цікавасць з боку даследчыкаў. На Ковеншчыне, як можна пераканацца пасля знаёмства з дакументамі архіва, яна мела сваю адметнасць. Калі на большай частцы Беларусі ўвядзенне рускай мовы ў дадатковае набажэнства, казанні і навучанне Закону Божаму ў школах вызначалася ў якасці аднаго са стратэгічных напрамкаў барацьбы з «польскасцю» ці падавалася як «распалячанне касцёла», то тут гаворка ішла аб замене пры выкладанні ў навучальных установах Закону Божага літоўскай мовы на рускую. А гэта вельмі балюча ўспрымалася большасцю каталіцкага насельніцтва, бо, па-першае, гэту акцыю цяжка было падаць як вырашэнне так званага «польскага пытання»; па-другое, канфесійны падзел насельніцтва тут быў не на карысць «рускага праваслаўнага элемента». Ды і нацыянальны літоўскі рух на рубяжы XIX—XX стст. быў непараўнальна мацнейшы за беларускі. Таму і супраціў з боку каталіцкага духавенства быў больш моцным, асабліва ў тых мясцовасцях, дзе пераважала літоўскае насельніцтва.

Калі прасачыць сітуацыю на той частцы Новааляксандраўскага павета, значную колькасць насельніцтва якой складалі беларусы, то відавочна, што праблема таксама канцэнтравалася ў навучальных установах. Адзін з дакументаў сцвярджаў, што ксёндз Маліноўскі з в. Плюсы неаднаразова парушаў прадпісанні начальства вучылішча адносна мовы навучання і ранішніх малітваў. З гэтай нагоды настаўнік Краснагорскага народнага вучылішча, якое тут знаходзілася, пісаў: «Ксендз и в сем году (1898. — *В. Я*, *Р. З.*) наделал мне много неприятностей, о которых много написано в объяснении к записи г. Инспектора, сделанной в ревизионной книге 11 минувшего февраля, но о таковых я при следствии говорил, так как доказывать последние его действия ко мне не имею возможности за недостатком свидетелей: кругом католики, я один, а ксендз имеет за себя прихожан» [39, арк. 18]. Працягвалі карыстацца літоўскай мовай у навучанні дзяцей і выпускнік Ковенскай духоўнай семінарыі законавучыцель Бейсагольскага вучылішча ксёндз Іосіф Дземенз, ксёндз Далідовіч з Шыманцкага вучылішча і іншыя святары.

І хоць большасць законавучыцеляў усё ж мусіла падпарадкавацца прадпісанню, сітуацыя іншым часам складвалася няпроста. Звесткі аб гэтым занатоўваюцца ў дакументах наступным чынам: «Ксендз Осип Янулайтис со дня ревизии преподавал Закон Божий во всех трех отделениях на русском языке, только в первом переводил с русского на литовский», «Ксендз Панцер при преподавании Закона Божия ученикам II отделения употребления литовского языка не допускал». У мястэчку Опса ранішнія малітвы ажыццяўляліся на лацінскай мове [39, арк. 9, 10, 19].

У цэлым, як сведчаць архіўныя дакументы, пытанне па забеспячэнні законавучыцельскіх пасад «добранадзейнымі» выкладчыкамі стаяла досыць востра. Некаторыя вакансіі захоўваліся больш за год, што нярэдка ўспрымалася з боку грамадзянскіх улад як нежаданне падпарадкоўвацца патрабаванням грамадзянскага кіраўніцтва з боку цяльшэўскага епіскапа.

Дакументы фіксуюць выпадкі фальсіфікацый адносна рэлігійнага прымусу. Так, новааляксандраўскі вікарый паведамляў цяльшэўскаму епіскапу аб тым, што вучняў Новааляксандраўскага гарадского вучылішча каталіцкага веравызнання настаўнік прымушаў прысутнічаць на праваслаўных набажэнствах у цэрквах. Інфармацыя атрымала пашырэнне і выклікала неабходнасць высвятлення на ўзроўні папячыцеля Віленскай навучальнай акругі. Загадчык вучылішча Бажко быў выкліканы ў Вільню для размовы з папячыцелем навучальнай акругі. Па сведчанні Бажко, прымусу не было, а вучні-католікі, якія прыйшлі на набажэнства ў праваслаўную царкву, зрабілі гэта добраахвотна. Разам з гэтым начальства вучы-

лішча было сур'ёзна занепакоена магчымымі падобнымі з'явамі і для прадухілення хваляванняў з боку каталіцкага насельніцтва строга забараніла прысутнасць вучняў-католікаў на праваслаўных набажэнствах [39, арк. 24, 28]. Цікава, што падобныя выпадкі нярэдка адбываліся і на іншай тэрыторыі Беларусі, але разбіральніцтваў на ўзроўні Вільні не сустракалі. Відаць, па прычыне перавагі праваслаўнага асяроддзя тут гэтыя падзеі не вельмі непакоілі высокае начальства.

Дакументы архіва адлюстроўваюць спробы вырашэння моўнага пытання ў адносінах да пратэстанцкага насельніцтва Ковеншчыны. Як і ў выпадку з рымска-каталіцкай царквой, справа датычылася мовы выкладання Закону Божага. Мова навучання Закону Божаму асоб неправаслаўнага веравызнання ў другой палове XIX ст. з'яўлялася асобным прадметам абмеркавання на ўрадавым узроўні. Была прынята пастанова аб магчымасці навучання неправаслаўных на «прыроднай» мове. Разам з гэтым паўставала пытанне, якая мова з'яўляецца «прыроднай» для жыхароў заходніх губерняў. Для Ковеншчыны, дзе пераважалі літоўскія вернікі, а таксама для латышскага насельніцтва Ковенскай губерні дырэкцыяй народных вучылішч пастановай ад 27 верасня 1869 г. было дазволена карыстацца пры навучанні Закону Божаму «местным наречием» (рашэнне зацверджана 13 чэрвеня 1870 г. Папячыцельскім саветам Віленскай навучальнай акругі) [47, арк. 2 адв. — 3].

Але, насуперак здаровай логіцы, у выніку збору матэрыялаў і правядзення кансультацый Вучылішчным саветам Ковенскай дырэкцыі народных вучылішч было прынята рашэнне, што «прыроднай» мовай для ўсіх вучняў школ Віленскай навучальнай акругі з'яўляецца руская [47, арк. 3 адв., 5]. У навучанні прадпісвалася карыстацца наступным прынцыпам: першы год навучаць дзяцей на літоўскай або латышскай мове, паралельна навучаючы іх рускай мове. Аднак евангеліцка-лютэранская кансісторыя працягвала хадайнічаць аб перавядзенні ўсяго працэсу на родную мову навучэнцаў. У 1898 г. Вучылішчны савет зноў звярнуўся да гэтай праблемы, сцвярджаючы, што выкладанне Закону Божага на роднай мове навучэнцаў павінна было разумецца «далеко не в смысле желательном Евангелическо-Лютеранской Генеральной Консистории, а а) назначен один только первый год на преподавание Закона Божия на местном наречии, после чего этот предмет должен быть преподаваем на русском языке с допущением местных наречий для перевода или пояснения непонятных детям русских слов, б) вопрос о преподавании местных наречий решен почти во всем отрицательно на том основании, что дети иноверцев нуждаются не в изучении племенных языков, а в усвоении их грамоты, — грамота же всех языков литовского происхождения по всему Виленскому Округу преподается в буквах русского алфавита, следовательно, с обучением русской грамоте дети должны обучаться и своим племенным грамотам». Таксама адзначалася, што «введение преподавания Закона Божия на местном наречии и обучение в народных школах природным языком не только не вызывается местными нуждами и условиями, но и принесло бы невознаградимые потери интересам распространения русской грамотности и усвоения местным инородческим населением государственного языка» [47, арк. 3].

Адначасова дакументы адлюстроўваюць рэальную сітуацыю з «прыроднай» мовай вучняў-пратэстантаў і мовай выкладання Закону Божага пратэстантам у Ковенскай губерні. Так, па стане на 1898 г. у народных вучылішчах губерні навучалася 982 лютэраніны — пераважна літоўцы, часткова латышы. 387 з іх добра валодалі нямецкай мовай, астатнія размаўлялі на мясцовых мовах. Што датычыла мовы выкладання Закону Божага, у значнай колькасці выпадкаў ёй была літоўская [47, арк. 4 адв., 16, 16 адв.]. Пасля выдання цыркуляра аб выкладанні з другога класа Закону Божага на рускай мове досыць моцным быў супраціў з боку пратэстанцкіх выкладчыкаў. Так, у рапарце настаўніка Радзівілішскага народнага вучылішча К. Трафімава ад 14 студзеня 1899 г. адзначана, што кістар і выкладчык Закону Божага Фішар заявіў: «Без распоряжения евангелическо-реформатской коллегии он считает себя не вправе начать преподавание Закона Божия ученикам 1 отделения на русском языке» [51, арк. 17 адв.].

Такім чынам, мерапрыемствы ў канфесійнай галіне былі скіраваны на падтрымку і рэалізацыю агульнадзяржаўнай палітыкі па русіфікацыі паўночна-заходніх губерняў. Але ў адносінах да пратэстанцкага літоўска-, латышска- і нямецкамоўнага насельніцтва абмежавальныя меры ў адукацыйнай галіне былі распачаты значна пазней, чым падобныя ў адносінах да пратэстанцкага і каталіцкага польскамоўнага насельніцтва беларуска-літоўскіх губерняў.

Асобныя дакументы асвятляюць пытанні, звязаныя з удзелам розных канфесій і іх вернікаў у справе арганізацыі прыватных вучылішч на пачатку XX ст. Як паказваюць дакументы, найбольшую актыўнасць у дадзеным напрамку праяўлялі каталіцкая і лютэранская цэрквы, а таксама прадстаўнікі іўдзейскага веравызнання [48]. Пры гэтым неабходна адзначыць актывізацыю канфесійных таварыстваў (напрыклад, каталіцкіх таварыстваў рабочых) у справе арганізацыі навучальных устаноў для сваіх дзяцей. Выяўленыя даныя могуць быць выкарыстаны для ілюстрацыі больш высокай актыўнасці рэлігійных інстытутаў Ковеншчыны ў грамадскім жыцці губерні ў параўнанні з іншымі беларуска-літоўскімі губернямі.

Сярод аспектаў урадавай палітыкі ў адносінах да каталіцкага касцёла, якія адлюстраваны ў дакументах архіва, можна вылучыць рэгуляванне выдавецкай дзейнасці. Калі да 1840-х гг. касцёл у Расійскай імперыі актыўна займаўся выдавецкай дзейнасцю, то з 1843 г. гэты напрамак быў забаронены. Адбывалася масавае закрыццё каталіцкіх (ордэнскіх і дыяцэзіяльных) друкарняў. Дакументы архіва адлюстроўваюць працэс рэалізацыі гэтых пастаноў на Ковеншчыне [49].

Канец XIX — пачатак XX ст. быў часам як афармлення веравучэння, так і арганізацыі новых пратэстанцкіх дэнамінацый і цэркваў. Адпаведна, неабходнай з'яўлялася выпрацоўка дзяржаўнага заканадаўства, якое б рэгулявала іх статус і дзейнасць у Расійскай імперыі. Дакументы архіва ўтрымліваюць цыркуляр ковенскага губернатара ад 12 лістапада 1906 г., у адпаведнасці з якім адвентысты атрымалі дазвол бесперашкодна адпраўляць набажэнствы ў спецыяльна ўладкаваных для гэтага дамах па аналогіі з дазволам, які атрымалі баптысты 27 сакавіка 1879 г. [50, арк. 90]. Дакумент дае магчымасць зразумець падставы такога рашэння: веравучэнне адвентыстаў МУС разумелася сугучным вучэнню баптыстаў. Адпаведна, у адносінах да іх прадпісвалася выкарыстоўваць аднолькавыя прававыя нормы [50, арк. 90].

Звесткі па памежных тэрыторыях, як правіла, дазваляюць больш наглядна прасачыць «зігзагі» сацыяльных, палітычных і канфесійных працэсаў у экстрэмальных сітуацыях, аб чым і сведчаць дакументы Каўнаскага акруговага архіва, што даюць магчымасць рэканструяваць сітуацыю напярэдадні і падчас Першай сусветнай вайны. У дадзеным артыкуле мы засяродзілі ўвагу на наступных аспектах: а) настроі грамадства і ўрадавыя мерапрыемствы напярэдадні і ў першыя месяцы вайны; б) штрыхі штодзённага жыцця; в) змены ў канфесійным становішчы Ковеншчыны.

Абвастрэнне адносін паміж Расіяй і Аўстрыяй выклікала больш пільную ўвагу ўладных структур да грамадска-рэлігійных настрояў насельніцтва заходняй часткі імперыі. Каталізатарам усплеску антыўрадавых настрояў, на іх думку, мог стаць 50-гадовы юбілей паўстання 1863—1864 гг. У пачатку 1913 г. перад паліцэйскімі службамі былі пастаўлены задачы не дапусціць святкавання азначанай падзеі. У цыркуляры ковенскага губернатара з гэтай нагоды адзначалася: «...в польских революционных кругах усилилась надежда на вооруженное, в ближайшем будущем, столкновение России с Австрией и на использование поляками этого столкновения в целях восстановления независимости... Празднование юбилея польского восстания, несомненно, в значительной степени подогреет возбужденное состояние враждебно настроенного против России польского населения в Привислинском, Юго-Западном и отчасти Северо-Западном Краях» [51, арк. 107]. Паліцэйскім чынам прадпісвалася прыняць усе неабходныя меры па недапушчэнні выкарыстання сітуацыі, у тым ліку зрабіць усё магчымае, каб і з боку рымска-каталіцкага духавенства ў касцёлах не было дапушчана ў той ці іншай форме «ознаменования годовщины восстания» [51, арк. 107].

Другой праблемай, якая ўспрымалася ўладнымі структурамі як адмоўная, стала распаўсюджванне сярод каталіцкага насельніцтва Царства Польскага, а адтуль — далей, на паўночны захад імперыі, align="left" рознага роду тайных таварыстваў накшталт Ганарацкага руху. У сувязі з гэтым у адрас губернатараў было накіравана «совершенно доверительное письмо» дырэктара Дэпартамента духоўных спраў ад 10 студзеня 1913 г. за № 305 з патрабаваннем узяць пытанне на кантроль і ў выпадку выкрыцця прыхільнікаў Ганарацкага руху прымаць меры «для возбуждения против виновных законного преследования» [51, арк. 179]. Адзначалася, што заснавальнікам Ганарацкага руху быў а. Ганарат (Казьмінскі), які вырашыў стварыць арганізацыю, незалежную як ад свецкай духоўнай улады, так і ад свецкай улады наогул, якая б «вдохнула религиозную жизнь в польское общество и демократизировало его на основе евангельских идеалов» [51, арк. 181]. Падобныя дакументы Каўнаскага архіва сугучныя з матэрыяламі Гродзенскага архіва, якія таксама фіксавалі сітуацыю на памежнай тэрыторыі.

Быў узмоцнены кантроль і за дзейнасцю дабрачынных таварыстваў, прававымі асновамі іх адкрыцця і дзейнасці. Вынікам новай палітыкі стала адмова зацвярджэння іх статутаў. Напрыклад, у 1913 г. у Новааляксандраўску планавалася заснаваць таварыства «Дом дзіцяці Ісуса», аднак дазволу на яго заснаванне МУС не дало [52]. Такі дазвол атрымлівалі пераважна тыя таварыствы, што былі скіраваны на паляпшэнне матэрыяльнага становішча. Так, было дазволена заснаванне пры рымска-каталіцкай духоўнай семінарыі дабрачыннага таварыства для дапамогі маламаёмасным семінарыстам. Пачатак вайны зрабіў вырашэнне гэтых пытанняў не проста больш складаным, а наогул немагчымым. Дакументы зафіксавалі факты недаверу да лютэранскіх дабрачынных таварыстваў нават пасля таго, як нямецкія і аўстрыйскія падданыя былі выселены з тэрыторыі губерні. Вось матыў ковенскага губернатара, на падставе якога ён прапаноўваў закрыць усе жаночыя дабрачынныя таварыствы: у лісце да міністра ўнутраных спраў ад 26 лютага 1915 г. ён пісаў, што «хотя членами их в данное время состоят одни только немцы русские подданные, но принимая во внимание, что до последовавшего распоряжения в них состояли членами также подданные воюющих с нами держав, не подлежит никакому сомнению, что все эти общества имеют в принципе тенденциозный характер и объединения немецкого элемента на почве национальных интересов. Существование подобных обществ, ведущих к усугублению начал национальной обособленности и розни, является крайне вредным и угрожающим общественным спокойствию и безопасности» [46, арк. 16 адв.].

Апісанне падзей Першай сусветнай вайны на Браслаўшчыне даволі падрабязна і дасканала даецца ў нарысе кнігі «Памяць» (аўтар К. Шыдлоўскі) [53, с. 211—220]. Нарыс утрымлівае апісанне ваенных дзеянняў, страты, што панесла браслаўская зямля ў выніку вайны. У дадатках прадстаўлены шэраг адпаведных дакументаў з Расійскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва. Матэрыялы Каўнаскага архіва раскрываюць іншы бок гэтага нялёгкага для тутэйшага насельніцтва перыяду — праблему штодзённасці. Дастаткова пазнаёміцца толькі з адной справай, якая ўтрымлівае дзясяткі тэлеграм, каб адчуць тую ступень разгубленасці і адчаю, што ахапіла ў 1915 г. як шэраговае насельніцтва прыфрантавых населеных пунктаў, так і грамадзянскіх і паліцэйскіх чыноў [54]. Пытанне аб эвакуацыі «вісела ў паветры» яшчэ з восені 1914 г., аб чым сведчыць архіўная справа «По эвакуации учреждений внутрь Империи по военным обстоятельствам. Начато сентября 8 дня 1914 г.» [59]. З гэтага часу кожная воласць павінна была мець у стане пастаяннай гатоўнасці вызначаную колькасць падвод «ввиду возможного получения предписания о немедленном вывозе казенного имущества и семей должностных лиц» [55, арк. 4, 5]. Відавочная актывізацыя назіраецца з лета 1915 г., калі 16 ліпеня губернатар паведаміў новааляксандраўскаму павятоваму спраўніку аб дазволе галоўнага начальніка Дзвінскай ваеннай акругі эвакуіраваць сем'і служачых, што пражывалі на ўсход ад лініі Якабштадт — Ракішкі — Свядосце — рака Свента да лініі Паўночна-Заходняй чыгункі [55, арк. 103].

Далей жыццё павета падпала пад прадпісанні тэлеграм з грыфам «по военным обстоятельствам». Яны то загадвалі не адпраўляць бежанцаў у напрамку Петраграда, а «преимущественно в Могилёвскую губернию»; то спачатку дазвалялі, а потым ужо загадвалі «теперь же эвакуировать из части губернии, входящей в войсковой район, семейств всех служащих правительственных учреждений... а также семей военнослужащих» [55, арк. 101, 106, 107]. Змест і характар тэлеграм цалкам знаходзіўся ў залежнасці ад стану ваенных поспехаў/няўдач. Згодна з загадам галоўнага начальніка Дзвінскай ваеннай акругі ад 15 жніўня 1915 г., у першую чаргу эвакуацыі падлягалі Дзяржаўны банк, цэрквы, навучальныя ўстановы. На месцах павінны былі заставацца: усе адміністрацыйныя ўлады, прадвадзіцель дваранства, паліцэйскія ўлады, паштовыя і тэлеграфныя ўстановы [55, арк. 102]. З тэлеграм за подпісам ковенскага губернатара, якія перадавалі загады галоўнакамандуючага ў павятовыя органы, вынікала, што найбольш нестабільным было становішча служачых паштовых і тэлеграфных устаноў. За дзень яны маглі атрымаць некалькі тэлеграм з супрацьлеглымі загадамі.

Асобным аспектам, які дапамагаюць рэканструяваць матэрыялы архіва, з’яўляюцца змены ў канфесійным становішчы Ковеншчыны і асобных цэркваў/канфесій у часы Першай сусветнай вайны. Датычна праваслаўнай царквы гэта перш за ўсё пытанні матэрыяльных страт праваслаўных храмаў [56, арк. 21].

Дакументальная спадчына, што зафіксавала змены ў становішчы рымска-каталіцкай царквы падчас Першай сусветнай вайны, прадстаўляе наступныя моманты: а) дакументы, што адлюстроўваюць перамяшчэнне/перавод каталіцкіх інстытутаў і духавенства, у тым ліку пераносы месцазнаходжання Цяльшэўскай епіскапскай кафедры (спачатку ў Відзы, пасля ў Смаленск [56, арк. 15, 26]); б) пытанні ўнутранай арганізацыі кіравання епархіяй [57, арк. 27, 29]; в) праблемы эвакуацыі ўстаноў [56, арк. 39—43]; в) рэарганізацыю сістэмы падрыхтоўкі і працэсу навучання ў духоўных навучальных установах [56, арк. 10—13]; г) гаспадарчыя пытанні [56, арк. 5—5 адв.]. Сустракаюцца справы па абвінавачванні прадстаўнікоў духавенства ў шпіянажы [61], прывядзенні іх да прысягі [58].

У архівасховішчы захаваўся ўнікальны для даследчыкаў канфесійнай гісторыі дакумент, які дае магчымасць рэканструяваць працэс, як на практыцы адбывалася выкананне рэлігійных запатрабаванняў насельніцтва рымска-каталіцкага веравызнання акупаванай тэрыторыі. Гэта паведамленне ад 8 жніўня 1916 г. з канцылярыі ковенскага губернатара (якое ў той час знаходзілася у г. Кастраме) у адрас новааляксандраўскага павятовага спраўніка. У дакуменце адзначалася: «Тельшевский р.к. Епископ... уведомил, что с Высочайшего соизволения он отправляется в сопровождении каноника Казимира Шавлиса и священника Казимира Палтарскага в занятую неприятелем часть вверенной ему Тельшевской или Самогитской епархии для исполнения своих обязанностей» [34, арк. 1].

Па прычыне таго, што матэрыялы, якія датычылі спраў дзяржаўнай аховы (падпадалі пад арт. 34 Палажэння аб дзяржаўнай ахове), распаўсюджваліся «для сведений» паліцэйскіх чыноў па ўсіх прыфрантавых губернях, у архіве можна сустрэць дакументы, якія напрамую адносяцца да тэрыторыі Беларусі. Так, у справе «О лицах, коим воспрещено жительство в пределах губернии. 1915 г.» утрымліваюцца звесткі аб жыхарах Мінскай і Магілёўскай губерняў, яўрэях па паходжанні, якія былі выселены з пачаткам (або напярэдадні) вайны з пастаяннага месца жыхарства. Яны падалі прашэнне аб памілаванні на пачатку 1915 г., і іх просьбы дзякуючы розным абставінам былі задаволены. Такімі абставінамі для зняцця абмежавання з мешчаніна Рэчыцкага павета Мінскай губерні Абрама Лейбы Фрадзіна стала тое, што тры яго сыны былі мабілізаваны ў дзеючую армію, у выніку чаго сям’я апынулася ў цяжкім становішчы [59, арк. 3].

У сакавіку 1915 г. ад ковенскага губернатара ў адрас павятовых спраўнікаў губерні паступіла распараджэнне пад грыфам «лично — совершенно секретно». У ім прадпісвалася «приостановить на время военных действий производство дел о выселении евреев из вверенной

Вам местности, в коей они незаконно проживают, не допуская, однако, новых поселений без законных к тому оснований. Распоряжение не подлежит оглашению во всеобщее сведение» [55, арк. 251]. Аднак супрацьлеглых рашэнняў прымалася значна больш, асабліва калі справы датычылі западозранасці ў шпіянажы або іншых парушэннях. У сакрэтным цыркуляры ковенскага губернатара ў адрас начальнікаў паліцыі ад 12 чэрвеня 1915 г. адзначалася: «По рассмотрению Особым Совещанием, образованным согласно ст. 34 Положения о государственной охране, обстоятельств дела о купце 3-й гильдии Зельмане Іоселеве Бурштейне, заподозренном в тайном переводе эмигрантов за границу. Г. Министр Внутренних Дел постановил: воспретить Зельману Бурштейну жительство... в столицах, а также в губерниях столичных, Бессарабской, Виленской, Витебской, Гродненской, Ковенской, Курляндской, Минской, Могилевской, Херсонской и Холмской на пять лет» [59, арк. 48].

Яшчэ больш жорсткімі былі адносіны да жыхароў нямецкага паходжання, асабліва тых, хто захаваў нямецкае або аўстрыйскае падданства. Звесткі аб іх пачалі збіраць яшчэ да пачатку ваенных дзеянняў і ставілі на мэце ўстанаўленне годнасці/прыналежнасці мужчынскай часткі гэтай групы насельніцтва да службы ў замежнай арміі. Адной з нагод для павышэння ўвагі да насельніцтва нямецкага паходжання паслужылі звесткі аб утварэнні ў Германіі «Союза для охраны германизма за границей» і тое, што гэты саюз пасылае ў нямецкія калоніі ў Расіі сваіх эмісараў, якія, «порицая все русское, пропагандируют среди немцев-колонистов и в особенности немцев-солдат русской службы идею пангерманизма и, между тем, оказывают своим соотечественникам материальную поддержку для скупки возможно большего количества земли преимущественно вдоль линии железных дорог, выгодных для немецких интересов» [51, арк. 74].

З пачаткам вайны пачалася дэпартацыя нямецкага насельніцтва з прыфрантавой паласы. Высылаліся не толькі мужчыны прызыўнога ўзросту, але і іншыя, асабліва ў выпадку западозранасці ў шпіянажы. У шэрагі высылаемых трапілі і лютэранскія пастары. З дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Рэспублікі Беларусь вядома, што на пачатку 1915 г. паміж расійскім і нямецкім урадамі было заключана пагадненне «о беспрепятственном выбытии в Германию» лютэранскіх святароў. Але не ўсе пастары паспяшаліся пакінуць месца жыхарства і працы, што і засведчыў адзін з дакументаў Каўнаскага акруговага архіва — сакрэтны цыркуляр ковенскага губернатара ў адрас начальнікаў паліцыі ад 8 чэрвеня 1915 г. У ім адзначалася: «Курляндский Губернатор отношением от 2 текущего июня, за № 2873, уведомил меня, что Помощник Главного Начальника Двинского Военного Округа на театре военных действий, предписанием от 28 мая с. г., за № 1326, воспретил Лестенскому ев.-лютеранскому пастору Вальтеру Карлову Крюгеру жительство в губерниях, объявленных на военном положении. Об изложенном даю знать Вашему Высокоблагородию для сведения и зависящих распоряжений на случай появления Крюгера в пределах вверенной Вам местности» [59, арк. 49].

Такім чынам, акрамя пашырэння геаграфічнай прасторы аб'екта даследавання — *гісторыя Беларусі*, паглыблення асобных даследчых праблем (пацвярджэння рэпрэзентатыўнасці матэрыялаў) шляхам увядзення новага фактагічнага матэрыялу, выяўлення тыповых рыс для ўсёй тэрыторыі Беларусі і рэгіянальных асаблівасцей дакументы Каўнаскага акруговага архіва даюць магчымасць удакладніць правільнасць канцэптуальнай падачы асобных звестак, выкарыстаўшы кампаратыўны метад даследавання. Прымяненне яго, на нашу думку, дае асаблівы плён у тых выпадках, калі той ці іншы аб'ект даследавання з'яўляецца тыповым для тэрыторыі Ковеншчыны (напрыклад: а) стараверы і іх удзел у палітычных падзеях XIX ст.; б) каталіцкія і пратэстанцкія дабрачынныя арганізацыі, іх распаўсюджванне і ўмовы дзейнасці; в) штодзённае жыццё насельніцтва і яго змены ў сувязі з пачаткам ваенных дзеянняў падчас Першай сусветнай вайны; г) моўная палітыка ў адносінах да рымска-каталіцкай і пратэстанцкай канфесій). Пералік гэтых, пераканаы, можна пашырыць, але для гэтага спатрэбіцца працяг знаёмства з матэрыяламі архіва.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Копысский З. Ю.*, *Чепко В. В.* Историография БССР (эпоха феодализма). Минск : Университетское, 1986. С. 65.

2. *Юозас Римкус, Виталия Гирчите.* Источники по истории Браслава в фондах Каунасского уездного архива Литвы // Браслаўскія чытанні: матэрыялы IV навук.-краязнаўчай канф. 24—25 красавіка 1997 г. Браслаў : Браслаўскае музейнае аб'яднанне, Браслаўскае краязнаўчае таварыства імя О. Гедэмана, 1997. С. 53—56.

3. Каўнаскі акруговы архіў (далей — КАА). Ф. І-2. Воп. 1. Спр. 1 — Статистические описания городов, волостей, учреждений Новоалександровского уезда 1885 г.

4. КАА. Ф. І-50. Воп. 1. Спр. 1868 — Ведомости о количестве евреев, синагог, молитвенных школ и др. за 1845 г. по уездам Ковенской губ.

5. КАА. Ф. І-293. Воп. 1. Спр. 317 — Дело о Талмуд-Торах за 1912 г.

6. КАА. Ф. І-293. Воп.1. Спр. 138 — Сведения о училищах Ковенской губернии, предоставленные в Петербургский комитет грамотности, 1894—1897 гг.

7. КАА. Ф. І-3. Воп. 1. Спр. 46 — Статистические сведения за 1915 г.

8. КАА. Ф. І-50. Воп. 2. Спр. 74 — Статистические сведения о речном судоходстве. 1876 г.

9. КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 1 — Списки участников восстаний. 1831—1836 гг.

10. КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 322 — Списки восставших, казненных по уездам во время восстания в Литве (о повешании ксендза Антона Мацкевича 16 декабря 1863 года в г. Ковно), 1864 г.

11. КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 539 — О награждении старообрядцев Акинфова и Смирнова, пострадавших от восстания 1863 г.

12. КАА. Ф. І-1602. Воп. 2. Спр. 376 — Дело по обвинению Черноцкого Константина в подговоре к мятежу старообрядцев, 1868 г.

13. *Иоффе Э. Г.* К вопросу об участии белорусских и литовских евреев в восстании 1863—1864 гг. // Паўстанне 1863—1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне: гісторыя і памяць: зб. навук. арт / уклад. В. В. Яноўская, А. У. Унучак, А.Э. Фірыновіч; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск : Беларуская навука, 2014. С. 170—178.

14. КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 786. — О продаже пороха восставшим проживающего в Новоалександровском уезде еврея Мовши Брава.

15. КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 172 — Дело о римско-католических монастырях в связи с восстанием 1863 г.

16. КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 172 — О ксендзе, обвиняемом в подговоре крестьян к восстанию. 1863 г.

17. КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 637 — О ксендзе Новоалександровского уезда Антоне Жвыловском, подрывающем авторитет православной церкви. 1864—1865 гг.

18. КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 997. — Список ксендзов, обвиняемых в деятельности против царского самодержания.

19. КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 14 — О выступлении кс. Викентия Лукашевича против правительства, 1861 г.

20. КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 323 — Показания восставших, взятых в плен, о лицах, участвовавших в восстании (проповеди и призывы кс. Мацкевича), 1864 г.

21. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. II (1772—1903 гг.) / пад рэд. Н.М. Нікольскага, Д. А. Дудкова, І. Ф. Лочмеля. Мінск : Выд-ва АН БССР, 1940. 938 с.

22. КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 214 — Об отзыве Тельшевского римско-католического епископа подведомственным ему ксендзам, 1863 г.

23. КАА. Ф. І-50. Воп. 3. Спр. 803 — О награждении медалью муллы Якова Якубовского, 1866 г.

24. КАА. Ф. І-1468 (раней — 337). Воп. 2. Спр. 492 — О закрытии белорусско-литовской коллегии, 1843 г.

25. КАА. Ф. І-1468 (раней — 337). Воп. 2. Спр. 130 — О причислении грекоуниатских училищ к ведению комиссии народных училищ, 1836 г.

26. КАА. Ф.І-66. Воп. 6. Спр. 177 — План плацевой земли Браславской православной церкви.

27. КАА. Ф.І-66. Воп. 6. Спр. 268 — Геометрический специальный план трёх полос и озера Святцы, владения Браславской православной церкви.

28. КАА. Ф.І-66. Воп. 6. Спр. 284 — Геометрический специальный план острова Чайчин и речки Засоенки, владения Браславской православной церкви.

29. КАА. Ф. І-1468 (раней — Ф. 337. Воп. 1). Воп. 2. Спр. 224 — Об открытии дьячковского училища при Березвецком монастыре, 1839 г.

30. КАА. Ф. І-50. Воп. 1. Спр. 4661 (По предложению Г. Генерал-Губернатора) о неуспешности работ по постройке церквей в местечках Браславе и Антолептах, 1849 г.

31. КАА. Ф. І-50. Воп. 2. Спр. 34 — Дело об устройстве православных храмов в казенных имениях западных губерний.

32. КАА. Ф. І-2. Воп. 1. Спр. 20 — Книги записи католического духовенства.

33. КАА. Ф. І-2. Воп. 1. Спр. 460 — О римско-католическом духовенстве, 1915 г.

34. КАА. Ф. І-2. Воп. 1. Спр. 553 — О римско-католическом духовенстве, 1916 г.

35. КАА. Ф. І-50. Воп. 2. Спр. 158 — О присяге римско-католического духовенства.

36. КАА. Ф. І-50. Воп. 2. Спр. 187 — О переменах по службе римско-католического духовенства.

37. КАА. Ф. І-50. Воп. 1. Спр. 25067. Арк. 1 — О вредной деятельности настоятеля Субочского костела ксендза Франца Козловского, 1914 г.

38. КАА. Ф. І-293. Воп. 1. Спр. 95 — По замещению ксендзов законоучителями римско-католического исповедания в народные и приходские училища Ковенской губернии, 1884—1885 гг.

39. КАА. Ф. І-293. Воп. 1. Спр. 170 — О введении предклассной молитвы для учеников-католиков и о законоучителях римско-католического вероисповедания, 1898 г.

40. КАА. Ф. І-50. Воп. 1. Спр. 756 — О содержании, получаемом из казны лютеранскими проповедниками, 1844 г.

41. КАА. Ф. І-50. Воп. 1. Спр. 2465. — Дело о принятии лютеранства 46 крестьянами Новоалександровского уезда, 1847 г. (назва справы не адпавядае зместу. — *В. Я.*, *Р. З.*).

42. КАА. Ф. І.-1602. Воп. 2. Спр. 375. Арк. 45 — О крестьянах Видзской волости, подлежащих православию, 1867 г.

43. КАА. Ф. 1602. Воп. 2. Спр. 225. Арк. 18-19 — О совращении жителей г. Видзы их православной веры в раскол, 1827 г.

44. КАА. Ф. І-53. Воп. 1. Спр. 137 — О регистрации общества вспомоществования несостоятельным Тельшевской или Самогитской духовной семинарии в г. Ковне, 1909 г.

45. КАА. Ф. І-53. Воп. 1. Спр. 143. О регистрации обществ, преследующих, между прочим, религиозные цели, 1909 г.

46. КАА. Ф. І-50. Воп. 1. Спр. 24346. — Об утверждении устава Евангелического лютеранского женского благотворительного общества в м. Таурогене, 1913 г.

47. КАА. Ф. І-293. Воп. 1. Спр.171 — О преподавании Закона Божьего в лютеранских училищах, 1898—1899 гг.

48. КАА. Ф. І-293. Воп. 1. Спр. 246 — Дело о частных училищах и прогимназиях разных вероисповеданий, 1907 г.

49. КАА. Ф. І-50. Воп. 1. Спр. 400 — О закрытии типографий, находящихся при римско-католических епархиальных управлениях, 1844 г.

50. КАА. Ф. І-2. Воп. 1. Спр. 24 — К сведению и руководству на 1906 г.

51. КАА. Ф. І-2. Воп. 1. Спр. 124 — Циркуляры Ковенского губернатора.

52. КАА. Ф. І-50. Воп. 1. Спр. 24314 — Об утверждении устава римско-католического благотворительного общества в г. Новоалександровске и его приходе, 1913 г.

53. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. Мінск, 1998.

54. КАА. Ф. І-50. Воп. 2. Спр. 153 — Телеграммные распоряжения по вопросам эвакуации, 1915 г.

55. КАА. Ф. І-2. Воп. 1. Спр. 316 — По эвакуации учреждений внутрь Империи по военным обстоятельствам. Начато сентября 8 дня 1914 г.

56. КАА. Ф. І-50. Воп. 2. Спр. 225 — Переписка и распоряжения о переводах духовных училищ, монастырей и церквей, о различных служебных изменениях среди духовенства в связи с военными действиями, 1915 г.

57. КАА. Ф. І-50. Воп. 1. Спр. 327 — О ксендзе, подозреваемом в шпионаже.

58. КАА. Ф. І-50. Воп. 2. Спр.158 — О числе римско-католического духовенства, 1914 г.

59. КАА. Ф. І-2. Воп. 3. Спр. 464 — О лицах коим воспрещено жительство в губернии, 1915 г.

Статья поступила в редакцию 12 декабря 2014 г.